# СУВЕРЭНІТЭТ РЭСПУБЛІКІ: РЭАЛЬНЫ, А НЕ ДЭКЛАРАТЫЎНЫ

**Нядаўна ў рэспубліканскіх газетах апублікавана запіска народнага дэпутата, Старшыні Вярхоўнага Савета БССР М. І. Дземянцея аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі. Гэты дакумент у якасці афіцыяльнага быў распаўсюджаны на сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Ён выклікаў велізарную цікавасць новымі, неардынарнымі падыходамі. У сувязі са шматлікімі пытаннямі карэспандэнт БЕЛТА ўзяў у М. І. ДЗЕМЯНЦЕЯ інтэрв'ю.**

**Карэспандэнт:** Мікалай Іванавіч, у сваёй запісцы Вы прынцыпова па-новаму ставіце многія пытанні, якія датычаць забеспячэння суверэнітэту рэспублікі. Чым выкліканы такі радыкальны падыход?

**М. Дземянцей:** Справа ў тым, што на ўзроўні звычайнай свядомасці значэнне паняцця суверэнітэт у нас неяк сцёрлася. Цяпер далёка не ўсе ўяўляюць, што яно на самай справе азначае. А на самай справе суверэнітэт ёсць не што іншае, як вяршэнства рэспублікі, яе незалежнасць у вырашэнні асноўных пытанняў унутранага і знешняга жыцця, дзяржаўнага, эканамічнага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва. Каб забяспечыць увасабленне гэтых катэгорый у рэальнае жыццё, зыходзячы з сённяшняга становішча рэспублікі, без радыкальных мер не абысціся. І ўсё ж я палічыў бы за лепшае не ўжываць словы «радыкальныя меры». Патрэбны ўсебаковы, узважаны, навуковы падыход да гэтай праблемы.

**Карэспандэнт:** Знаёмячыся з Вашай запіскай, я выявіў, што асобныя палажэнні, якія датычаць суверэнітэту, ёсць у дзеючай Канстытуцыі БССР. Ці не з'яўляецца іх перанясенне з Канстытуцыі ў дэкларацыю ў нейкай меры паўтарэннем пройдзенага? Уласна, у чым тут справа?

**М. Дземянцей:** Гэта не простае пытанне. Ёсць рад палажэнняў Канстытуцыі, без якіх нельга гаварыць аб суверэнітэце, ці гэта суверэнітэт Беларускай ССР або іншай дзяржавы. Такім чынам, каб прыняць дэкларацыю аб суверэнітэце Беларускай ССР, без упамінання аб гэтых канстытуцыйных нормах не абысціся. Але сукупнасць іх у цяпер дзеючай Канстытуцыі, каб забяспечыць становішча Беларускай рэспублікі як сапраўды суверэннай дзяржавы, недастатковая. Значыць, кола гэтых гарантый павінна быць істотна расшырана, што і зроблена ва ўпамянутым вамі дакуменце. Гэта па-першае.

Па-другое, і гэта галоўнае — неабходна забяспечыць не проста суверэнітэт Беларускай ССР — фармальна ж ён абвешчаны на канстытуцыйным узроўні. Але, як мы цяпер ведаем, канстытуцыі бываюць, умоўна кажучы, фармальныя і рэальныя. Па раней дзеючых стэрэатыпах нам унушалі (прычым рознымі спосабамі і даволі эфектыўна), што канстытуцыі першага тыпу — фармальныя — уласцівыя толькі буржуазнаму грамадству. Аднак жыццё ставіць усё на свае месцы. І мы цяпер бачым, што эпітэт «фармальная» вельмі ў многім прымяняльны да нашай канстытуцыйнай праватворчасці.

Не адмаўляючы таго факта, што многія палажэнні, замацаваныя ў Канстытуцыі СССР, Канстытуцыі БССР, даволі прагрэсіўныя, нельга не прызнаць дэкларатыўны характар тых з іх, якія не напоўнены рэальным зместам і не «працуюць». Сказанае ў поўнай меры адносіцца не толькі, напрыклад, да забеспячэння рада правоў чалавека, іншых важнейшых інстытутаў жыцця грамадства, але і да суверэнітэту Беларускай ССР. Значыць, асноўны акцэнт маёй заявы Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР зроблены на забеспячэнне іменна рэальнай, а не толькі дэкларатыўнай незалежнасці рэспублікі, на забеспячэнне яе вяршэнства ў вырашэнні асноўных пытанняў унутранага і знешняга жыцця.

Я не буду пералічваць прыклады, каб паказаць практычна поўную адсутнасць гэтай незалежнасці. Круг іх поўнасцю ахапіў бы ўсе важнейшыя бакі жыцця беларускага народа. Нягледзячы на афіцыяльнае прызнанне Канстытуцыяй СССР саюзных рэспублік суверэннымі сацыялістычнымі дзяржавамі, у літаратуры, у перыядычным друку, у штодзённым побыце людзей — практычна ніхто ніколі не гаворыць «Беларуская дзяржава». Усе гавораць: «Беларуская рэспубліка». Быццам бы адно і тое ж, але не зусім. Выраз «Беларуская рэспубліка» ў шырокіх масах цяпер не асацыіруецца з выразам «Беларуская дзяржава». Маленькі нюанс, але ён гаворыць пра многае.

Думаю, што наша першарадная задача — надаць беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці рэальны, а не толькі фармальны сэнс.

**Карэспандэнт:** Так, але чаму Вы лічыце, што іменна гэта першачарговая задача Вярхоўнага Савета? Некаторыя лічаць, што, нягледзячы на ўсю важнасць данай праблемы, ёсць больш значныя, напрыклад, пераадоленне застойных з'яў у эканоміцы.

**М. Дземянцей:** Безумоўна, гэта вельмі важнае пытанне, якое не церпіць адкладу. Ды і з пункту гледжання нашых класічных канонаў, якія сцвярджаюць, што эканоміка — гэта базіс, які вызначае характар і змест надбудовачных адносін. Здавалася б, павінна так і быць: спачатку разбяромся з эканомікай, а потым будзем вырашаць і іншыя пытанні — дзяржаўнай самастойнасці, развіцця культуры і г. д. Але гэта спрошчаны падыход. Не трэба забываць, што такое разуменне суадносін базіса і надбудовы надта аднабаковае, ды і вельмі ўмоўнае.

Думаю, што трэба зыходзіць і з адваротнага ўплыву надбудовы на базіс, у тым ліку такога яе элемента, як дзяржава. І потым, хіба можна адмаўляць, што валоданне ўсёй паўнатой дзяржаўнай улады дае магчымасць накіраваць развіццё вытворчых адносін іншым шляхам, чым яно ішло да гэтага часу?

Што цяпер для нас актуальна ў галіне эканомікі? Не памылюся, калі скажу — не на словах, а на справе стварыць умовы для забеспячэння сапраўднай эканамічнай самастойнасці работніка вытворчасці, усямернай абароны інтарэсаў спажыўца, ліквідацыі ўсіх відаў манапалізму, шырокага развіцця здаровай прадпрымальнасці і г. д. Відавочна, што вырашаць такія пытанні можна толькі маючы рэальны суверэнітэт. Яго ж пакуль што ў Беларусі няма, і вырашаць пералічаныя пытанні на якасна новым узроўні мы не можам.

Вось пацвярджэнне. Па многіх паказчыках эканамічнага развіцця — і прамысловасці, і сельскай гаспадаркі, у сферы кіраўніцтва якой я раней працаваў, наша рэспубліка займае, без перабольшання, нядрэнныя пазіцыі. Аднак пры цяперашнім узроўні нашай самастойнасці ў саставе Саюза ССР, колькі б беларускі народ ні нарошчваў аб'ёмы вытворчасці, колькі б ні дабіваўся зніжэння сабекошту прадукцыі, усе намаганні рэспублікі могуць быць зведзены практычна да нуля некалькімі няўдалымі і безадказнымі рашэннямі так званага цэнтра.

Возьмем апошнія гады. Пры агульнай правільнай канцэпцыі пераходу да рынку, з забеспячэннем належнага ўзроўню сацыяльнай абароненасці насельніцтва, многія канкрэтныя рашэнні былі няўдалымі. Гэта тая ж адмена кантролю за прыростам заработнай платы і цэн пры тым, што ўсе іншыя элементы новага гаспадарчага механізма не атрымлівалі фактычнага развіцця і нават стрымліваліся. Усё гэта адмоўна адбілася на выпуску тавараў і прадуктаў харчавання.

Не забяспечвалася роля дзяржавы, якую яна павінна адыгрываць ва ўмовах сапраўдных таварна-грашовых, гасразліковых адносін у эканоміцы. А іменна — жорсткі кантроль за захаваннем спажывецкіх параметраў па якасці прадукцыі, рэгуляванне эканамічнымі, а не адміністрацыйнымі метадамі аб'ёмаў вытворчасці, у прыватнасці, шляхам устанаўлення стымулюючых даходаў, падаткаў, працэнтных ставак на крэдыты і г. д. Не адмаўляючы ўсёй складанасці, неардынарнасці праблемы пераходу да рынку, ясна, што, не маючы дакладнага плана або рашучасці забяспечыць яго, нельга рабіць тое, што было зроблена ў нас у краіне адносна выпуску незабяспечанай таварамі грашовай масы.

Калі не перагледжана структура капітальных укладанняў, то зразумела, што фонд спажывання можа быць павялічаны толькі ў такім размеры, у якім атрыманы прырост нацыянальнага даходу. Лічыць жа, што ўзровень жыцця насельніцтва можна палепшыць толькі выпускам дадатковых асігнацый — наіўнасць.

А цяпер скажыце, ці можна спадзявацца, што ў будучым уся палітыка цэнтра ў галіне эканомікі стане выключна рацыянальнай? Такіх гарантый пакуль што няма.

Апошнія мерапрыемствы па пераходу да рынку, намячаемыя саюзным урадам, прымушаюць засумнявацца ў тым, што ён здольны зрабіць гэта дастаткова аптымальным спосабам. Рэзкае павышэнне цэн і адначасовае зніжэнне ўзроўню жыцця народа, а гэта не выключана, непрымальнае па той простай прычыне, што ёсць нямала спосабаў пазбегнуць такіх антынародных мер. Такім чынам, па ўсіх іншых пытаннях — будзе гэта ўздым навуковага патэнцыялу, далейшае развіццё аграрнага, прамысловага, будаўнічага сектараў, сацыяльнай сферы, культуры — без рэальнага суверэнітэту іх вырашыць непасрэдна ў рэспубліцы нельга.

**Карэспандэнт:** Мікалай Іванавіч, у адным з выступленняў у перыядычным друку прагучала, што неабходнасць прыняцця дэкларацыі аб суверэнітэце Беларускай ССР была прызнана большасцю Вярхоўнага Савета БССР пасля ўказання «зверху», што, маўляў, «група дэпутатаў Дэмакратычнага блока» прапанавала пытанне аб суверэнітэце ўключыць у парадак дня Вярхоўнага Савета рэспублікі раней. Што Вы можаце сказаць наконт гэтага?

**М. Дземянцей:** Так, сапраўды, у першыя дні работы сесіі аб гэтым упаміналася. Гаварыў аб суверэнітэце рэспублікі і я ў сваім выступленні перад выбраннем на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета. Больш таго, гэта праблема хвалявала мяне і раней, яшчэ на былой рабоце. Але цаставіць пытанне афіцыяльна, г. зн. унесці адпаведныя дакументы на разгляд вышэйшай інстанцыі рэспублікі, якой з'яўляецца Вярхоўны Савет БССР, я, як палітычны дзеяч, змог толькі тады, калі ход палітычнай рэформы паказаў, што гэта рэальны, ажыццявімы крок, а не ідэя дзеля ідэі.

**Карэспандэнт:** На падставе якіх фактаў Вы прыйшлі да вываду аб своечасовасці ўнясення сваёй запіскі, якая прэтэндуе, магчыма, на тое, каб стаць асновай дэкларацыі?

**М. Дземянцей:** Ва ўмовах перабудовы такіх фактаў накоплівалася з кожным днём усё больш. Напрыклад, 26 красавіка гэтага года на саюзным узроўні прыняты Закон СССР аб размежаванні паўнамоцтваў паміж Саюзам ССР і суб'ектамі федэрацыі. Не буду яго характарызаваць, але скажу прама — ён мала дае для забеспячэння сапраўднай незалежнасці саюзных рэспублік, не прасякнуты духам прызнання іх рэальнага суверэнітэту. Яшчэ ў большай меры гэта датычыць раней прынятых законаў СССР — «Аб агульных асновах мясцовага самакіравання і мясцовай гаспадаркі ў СССР», «Аб асновах эканамічных адносін Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік». А па іх жа мы павінны будаваць свае ўзаемаадносіны з цэнтрам.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*

(Заканчэнне на 2-й стар).